*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

18 КАСТРЫЧНІКА 2007 г.
ЧАЦВЕР
№ 199 (26064)

Кошт 380 рублёў

ВЫДАЕЦЦА 3 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Ведай нашых!

## Харaство беларускі ацанілі



Прыгажуні сямідзесяці краін свету сабраліся ў Токіо, каб журы выбрала самую прывабную, абаяльную, вартую тытулу «Міс Інтэрнэшнл-2007» дзяўчыну. Хоць гэты конкурс праходзіць з 1960 года, Беларусь дэбютавала на ім толькі сёлета. І адразу такі поспех: наша Юлія Сіндзеева *(на здымку справа)* стала другой Віцэ-міс. Гэта ўжо не першае дасягненне 20-гадовай Юліі Сіндзеевай: Віцэ-міс Беларусь-2006 заняла чацвёртае месца на прэстыжным конкурсе «Міс Еўропа». Дарэчы, у снежні Юля прадставіць нашу краіну на «Міс свету-2007» у Пекіне. Туды яна адпраўляецца 1 лістапада.

Найпрыгажэйшай сярод прыгажунь на «Міс Інтэрнэшнл-2007» назвалі мексіканку Прысцылу Пералес.

**Ірына ПРЫМАК.**

## КАРОЛЬ РЫНГА!

**Беларускі баксёр-прафесіянал Юрый Раманаў у другі раз абараніў тытул чэмпіёна Еўропы ў лёгкай вагавай катэгорыі (да 61,235 кілаграма). Яго сапернікам быў баец з вопытам — італьянец Стэфана Дзоф, чэмпіён свету WBA, дзевяціразовы чэмпіён кантынента, які 43 разы святкаваў перамогу ў 54 баях, прычым з іх 17 выйграў накаўтам. Рэкорд Раманава — 19 перамог у 21 сустрэчы на рынгу (13 выйгрышаў накаўтам). Бой праходзіў у мінскім Палацы спорту.**

Фота Вольгі ЛАСКА.



Перад боем Раманаў казаў, што настройваўся на ўсе 12 раўндаў. Так і выйшла: беларус выйграў па ачках. «Хутчэй за ўсё ў нашым адзінаборстве верх узяла маладосць, — сказаў чэмпіён. — Стэфана — баксёр з характарам, настырны, непадатлівы. Апошнія баі я выйграваў з вялікай перавагай, а тут перамога далася не так проста. Буду працаваць над памылкамі».

Яшчэ адзін прадстаўнік нашай краіны, сярэбраны прызёр Алімпіяды ў Афінах, Магамед Арыпгаджыеў выйграў прэтэндэнтны бой на тытул чэмпіёна СНД і славянскіх краін у паўцяжкай вагавай катэгорыі (79,379 кг). Ён сустракаўся з расіянінам Арцёмам Вычкіным і аказаўся наймацнейшым таксама, як Раманаў, па ачках. «Быў момант, калі я сумняваўся ў выніку паядынку, — дзеліцца сваімі думкамі пераможца. — Калі сапернік рассек мне брыво, я спужаўся, што мяне могуць зняць, бо рана аказалася глыбокай. А так я быў упэўнены ў сваім поспеху, бо Вычкін мне ўступае ў тэхнічным плане».

**Ірына ПРЫМАК.**

Памяць

## Брацкія могілкі ў Мінску: час аднавіць справядлівасць

**Пра Старажоўскі рынак у Мінску памятаюць амаль усе дарослыя мінчане, а вось сведкаў таго, што на гэтым месцы былі вайсковыя могілкі часоў Першай сусветнай, ужо амаль не засталося. Аднак знайшліся архіўныя дакументы, якія пацвердзілі: паміж сучаснымі вуліцамі Старавіленскі тракт і Чарвякова з 1914-га да пасляваенных гадоў існавалі могілкі. Сёння гэтаму месцу прысвоены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. З 2004 года Мінгарвыканкамам і Мінкультуры праводзіцца распрацоўка праекта добраўпарадкавання тэрыторыі. Нямала тут зрабіў і Уладзімір ДЗЯНІСАЎ, галоўны архівіст Нацыянальнага гістарычнага архіва Рэспублікі Беларусь. Яго мы распыталі пра гісторыю Брацкіх могілак і сучасны іх стан.**

**— Уладзімір Мікалаевіч, нагадайце, калі і пры якіх абставінах былі ўтвораны Брацкія могілкі?**

— Калі пачалася Першая сусветная вайна, востра паўстала праблема пахавання воінаў, якія загінулі на фронце і памерлі ў шпіталях. Адначасова расійскі ўрад падняў праблему аб увекавечанні памяці ваеннаслужачых, якія аддалі свае жыцці за Айчыну. Тады ж было зацверджана Палажэнне аб Аляксандраўскім камітэце аб параненых, які ствараўся пад Найвысачэйшым патранатам. Ужо 26 верасня 1914 года ў Мінскую гарадскую Управу і, у прыватнасці, гарадскому галаве быў накіраваны ліст, у якім гаварылася, што «одной из главнейших задач деятельности Александровского комитета относится почитание памяти убитых воинов».

***(Заканчэнне на 2-й стар.)***

## Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Мікалая Чаргінца з 70-годдзем

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў старшыню Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, старшыню Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалая Чаргінца з 70-годдзем.

«Няхай ваша дзейнасць і ў далейшым будзе такой жа рознабаковай і плённай, напоўненай новымі здзяйсненнямі на карысць беларускага народа», — гаворыцца ў віншаванні.

Аляксандр Лукашэнка пажадаў юбіляру здароўя, натхнення, поспехаў, бадзёрасці і аптымізму.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Прэса, эканомія і беражлівасць

**Эканомія энергіі з'яўляецца самай таннай і ў той жа час самай прымальнай яе крыніцай. Ёмкая, але вельмі правільная канстатацыя сітуацыі, з якой сёння сутыкаецца не толькі наша краіна, якая не мае ўласных буйных крыніц энергіі, але, напэўна, усе індустрыяльныя дзяржавы сучаснага свету. (Дарэчы, з больш чым 38 млн тон умоўнага паліва, якое штогод спажываецца ў Беларусі, толькі 16 працэнтаў — уласныя энергарэсурсы. Астатняе — закупляецца).**

Вялікая роля ў прапагандзе гэтага належыць беларускай прэсе, адзначыла ўчора на семінары кіраўнікоў дзяржаўных СМІ па пытаннях інфармацыйнага забеспячэння дзяржаўнай палітыкі ў галіне эканоміі і беражлівасці, дзейнасці рэгіянальнай прэсы першы намеснік міністра інфармацыі Лілія Ананіч. «Мы павінны працаваць тут актыўна, арыентуючыся на канкрэтны, патрэбны нашай краіне вынік».

І, як адзначыў намеснік начальніка галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Усевалад Янчэўскі, размова гэтая не была фармальнай, пустой. І гэтая зацікаўленасць павінна выліцца на старонкі газет, у тэле- і радыёперадачы, каб кожны грамадзянін краіны зразумеў, што і ад яго асабіста залежыць, як будзем жыць усе мы заўтра.

**Кар. «Звязды».**

## АРЭХІ Ў МІЖСТОЛЕВАЙ ПРАСТОРЫ

**Гомельскія памежнікі выявілі патаемнае сховішча ў пасажырскім цягніку «Сімферопаль—Мінск».**

Тут захоўвалася 25 кілаграмаў грэцкіх арэхаў, віна-гарэлачныя вырабы... Агульны кошт кантрабанды складае амаль 5 млн рублёў.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

## Каралева БМЗ

Фота БЕЛТА.



***Маладыя спецыялісты БМЗ прайшлі пасвячэнне ў металургі.***

***Нядаўняя выпускніца ВНУ, а цяпер майстар АТК трубнай вытворчасці БМЗ Ірына СЯСЬКОВА.***

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЮШЧАНКА ПАДТРЫМАЕ КАНДЫДАТУРУ ПРЭМ'ЕРА АД БЮЦ І НУ — НС

Прэзідэнт Украіны Віктар Юшчанка падтрымаў намер Блока Юліі Цімашэнкі і прапрэзідэнцкага блока «Наша Украіна — Народная самаабарона» сфарміраваць у парламенце «аранжавую» кааліцыю, а таксама выказаў гатоўнасць унесці прапанаваныя гэтай кааліцыяй кандыдатуры на пасаду прэм'ера і членаў урада для зацвярджэння Вярхоўнай Радай.

### СААКАШВІЛІ ПРАПАНАВАЎ ПАДОЎЖЫЦЬ ТЭРМІН СВАІХ ПАЎНАМОЦТВАЎ

Апазіцыя будзе змагацца з «узурпацыяй» улады.

Прэзідэнт Грузіі Міхаіл Саакашвілі прапанаваў павялічыць прэзідэнцкі тэрмін з чатырох да пяці гадоў, а таксама праводзіць парламенцкія і прэзідэнцкія выбары адначасова раз у пяць гадоў.

З такой ініцыятывай Саакашвілі выступіў на сустрэчы з парламенцкай большасцю ў Тбілісі. Нагадаем, што выбары прэзідэнта Грузіі павінны адбыцца восенню 2008 года. Тым часам аб'яднаная грузінская апазіцыя, у якую ўваходзяць дзесяць палітычных арганізацый, прыняла маніфест з асноўнымі задачамі сваёй палітычнай барацьбы. «Фактычна ў краіне ўстаноўлены палітычны тэрор і парушаны правы чалавека», сказана ў маніфесце.

### АКЦЫЯНЕРАЎ «ДНЕПРАГАЗА» «НАВУЧАЦЬ КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ»

Пракуратура Днепрапятроўскай вобласці праводзіць следчыя дзеянні з трыма падазронымі ў службовай халатнасці, якая прывяла да выбуху газу ў Днепрапятроўску. Сярод іншых арыштаваны і дырэктар ААТ «Днепрагаз». У выніку выбуху загінула 17 чалавек, 16 пацярпелых дагэтуль знаходзяцца ў бальніцы.

«Днепрагаз» кантралюе расійская кампанія ЗАТ «Комплексныя энергетычныя сістэмы» расійскага мільярдэра Віктара Вексельберга. Прэзідэнт Украіны Віктар Юшчанка папрасіў мэра Днепрапятроўска публічна запатрабаваць ад уласнікаў ААТ кампенсацыі ўрону і аказання дапамогі пацярпелым.

**Отдел образования Дзержинского райисполкома (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже зданий: старших классов общей пл. 501 кв.м, спортзала общей пл. 302,1 кв.м, котельной общей пл. 173,6 кв.м, начальных классов общей пл. 217,0 кв.м, Томковичской средней школы, расположенных: Минская обл, Дзержинский р-н, д. Томковичи. Площадь зем. участка 1,6666 га. Начальная цена — 179 220 560 бел. рублей. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Объект продается без условий. Переход права пользования земельным участком будет осуществлен по решению райисполкома. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 20.11.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 19.11.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34**
**Сайт в Интернете: www.rlt.by.**

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

**ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже жилого дома об. пл. 64,5 кв.м, расположенного на земельном участке пл. 0,1240 га (водоохранная зона реки Сервечь), по адресу: Минская обл., Мядельский р-н, г.п. Кривичи, ул. Набережная, д. 13. Начальная цена — 16 682 815 бел. рублей. Оплата за объект производится в течение 30 дней с даты проведения торгов. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 11.09.2007 г. Аукцион состоится 06.11.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 05.11.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34**
**Сайт в Интернете: www.rlt.by.**

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### У БЕЛАРУСІ НЕ АДБУДЗЕЦЦА СКАЧКА ЦЭНАЎ НА ВАЖНЕЙШЫЯ ХАРЧОВЫЯ ТАВАРЫ

**Аб гэтым паведаміў на семінары ў Мінску намеснік міністра эканомікі Уладзімір Адашкевіч.**

«Гэтыя цэны кантралююцца дзяржавай, таму скачкоў не будзе, — падкрэсліў Уладзімір Адашкевіч. — У тым ліку гэта датычыцца малака і малочнай прадукцыі». Адносна закупачных цэнаў на малако Уладзімір Адашкевіч адзначыў, што іх павышэнне адбываецца ў адпаведнасці з гадавым прагнозам, які прадугледжвае павелічэнне закупачных цэнаў на малако на 5 працэнтаў у студзені, на 5 працэнтаў у верасні і на 10 працэнтаў у кастрычніку. «Што датычыцца росту адпускных і рознічных цэнаў на харчовыя прадукты, то тут таксама ўсё будзе адбывацца ў рамках прагнозу. Ніякіх выраўноўванняў цэнаў на прадукты харчавання з іх узроўнем у Расійскай Федэрацыі ў Беларусі не разглядаецца», — запэўніў намеснік міністра. Паводле слоў Уладзіміра Адашкевіча, цэны на спажывецкія тавары ў Беларусі будуць павышацца ўмерана, у рамках інфляцыі. У прыватнасці, цэны на малочную прадукцыю, з улікам павышэння закупачных цэнаў, узрастуць прыкладна на 3 працэнты ў кастрычніку і лістападзе гэтага года і не больш як на 2 працэнты ў снежні. Намеснік міністра эканомікі таксама адзначыў, што цяпер у Беларусі не разглядаецца пытанне павышэння цэнаў на муку, хлеб і хлебабулачныя вырабы, мяса і мясную прадукцыю.

**Кар. БЕЛТА.**

### ПРАВІНЦЫЙНАЯ КАРУПЦЫЯ

**Былы дырэктар УП «Докшыцкае прадпрыемства меліярацыйных сістэм» Ш. і ягоны намеснік М. атрымалі хабар у памеры 80 тысяч долараў.**

Больш за тое, паводле звестак Генеральнай пракуратуры Беларусі, гэта была толькі першая частка «ганарару» памянёным асобам, якія абяцалі прадстаўнікам адной з фірмаў забяспечыць перамогу на аўкцыёне па продажу аб'ектаў нерухомасці, што належалі прадпрыемству. Бізнэсмены гатовы былі даць правінцыйным карупцыянерам хабар у памеры 170 тысяч долараў. Але гэты «гешэфт» спынілі супрацоўнікі праваахоўных органаў. Адметна, што хабарнікі дзейнічалі не наўпрост, а праз пасрэдніка — менеджара адной са сталічных фірмаў. За свае паслугі ён атрымаў 10 тысяч долараў. Аднак скарыстаць «брудныя» грошы таксама не паспеў. Хаўрусніка докшыцкіх карупцыянераў затрымалі. Высветлілася, што ён не толькі аказваў пасрэдніцкія паслугі хабарнікам, але і сам займаўся махлярствам. У прыватнасці, следства ўстанавіла, што гэты прайдзісвет шляхам падману і падробкі дакументаў атрымаў на складзе аднаго таварыства з абмежаванай адказнасцю харчовую прадукцыю коштам 32 мільёны рублёў.

Менеджар асуджаны да 10 гадоў пазбаўлення волі. Ягоныя докшыцкія «кліенты», атрымалі па 9 гадоў зняволення.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже административного здания об. пл. 690,1 кв.м, гаражей об. пл. 84,2 кв.м, расположенных в г. Молодечно, ул. Маркова, д. 16. Площадь зем. участка 0,2511 га. Начальная цена — 267 099 174 бел. рублей. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 10.08.2007 г. Аукцион состоится 06.11.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 05.11.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8017) 224 61 34**
**Сайт в Интернете: www.rlt.by.**

## БЕЛИНВЕСТБАНК

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС НА 1 ОКТЯБРЯ 2007 Г.

НАИМЕНОВАНИЕ БАНКА: **ОАО «БЕЛИНВЕСТБАНК»**

*в миллионах белорусских рублей*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2007 г. | 2006 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| *1* | *2* | *3* | *4* | *5* | *6* |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 1 | 125 925,6 | 85 709,6 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 2 | 123 057,1 | 92 379,8 |
| 4 | Ценные бумаги | 1103 | | 376 362,9 | 170 955,6 |
| | для торговли | 11031 | 3 | - | |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | 3.1 | *18 010,4* | |
| | в наличии для продажи | 11033 | 3.2 | *358 352,5* | *170 955,6* |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 4 | 181 549,1 | 224 031,2 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 5 | 1 819 266,5 | 1 169 734,9 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 6 | 421,4 | 472,5 |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 7 | 120 056,8 | 89 393,5 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 8 | 152 613,9 | 25 952,2 |
| **10** | **Итого активы** | **110** | | **2 899 253,3** | **1 858 629,3** |
| 11 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | 9 | 81 155,5 | 28 482,5 |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 10 | 133 458,0 | 97 315,9 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 11 | 2 201 830,5 | 1 399 269,6 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | | 18 673,0 | 1 992,3 |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 12 | 157 223,4 | 122 166,1 |
| 17 | Всего обязательства | 120 | | 2 592 340,4 | 1 649 226,4 |
| **18** | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 13 | 154 413,7 | 107 109,4 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | | 0,1 | 0,1 |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | | 19 939,6 | 16 080,4 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 14 | 78 341,9 | 45 398,4 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 15 | 54 217,6 | 40 814,6 |
| 24 | Всего капитал | 121 | | 306 912,9 | 209 402,9 |
| **25** | **Итого обязательства и капитал** | **12** | | **2 899 253,3** | **1 858 629,3** |
| **26** | **ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ** | | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 16 | **1 213 314,0** | **691 383,1** |
| 28 | Обязательства | 1302 | 17 | **492 006,5** | **310 836,7** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ НА 1 ОКТЯБРЯ 2007 ГОДА

НАИМЕНОВАНИЕ БАНКА: **ОАО «БЕЛИНВЕСТБАНК»**

*в миллионах белорусских рублей*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2007 г. | 2006 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| *1* | *2* | *3* | *4* | *5* | *6* |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 175 540,1 | 113 968,4 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 103 856,9 | 66 784,3 |
| 3 | *Чистые процентные доходы* | 201 | 18 | 71 683,2 | 47 184,1 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 67 567,2 | 66 261,9 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 5 374,2 | 4 529,6 |
| 6 | *Чистые комиссионные доходы* | 202 | 19 | 62 193,0 | 61 732,3 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | 20 | 19 415,5 | 20 273,1 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 21 | -82,7 | 76,2 |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | | 18,5 | 23,3 |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 22 | 6 369,2 | 7 735,4 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 23 | 6 856,3 | 5 102,6 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 24 | 100 963,7 | 87 389,2 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 25 | 5 313,6 | 4 181,0 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | | 10 618,4 | 8 953,2 |
| 15 | **Прибыль (убыток)** | **2** | | **36 818,9** | **26 132,8** |

Зам. Председателя Правления — Т.А. Новосельская
Главный бухгалтер — А.Н. Сырокваш

*Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 3 от 27.10.2006 г.*

# ПРЫВІТАННЕ З МІНУЛАГА

*У Мсціслаўскім гісторыка-археалагічным музеі адкрылася выстава паштовак і фота канца XIX — пачатку XX стагоддзяў*

### Сямейны архіў

Візітоўкай выставы стала паштоўка з выявай паштальёна і надпісам «Привѣтъ изъ...» Цікава, што драўляны будынак, дзе цяпер месціцца музей, раней займала пошта.

Паштоўкі належаць прыватнай калекцыі Зоі Урбановіч — жыхаркі Мсціслава, настаўніцы на пенсіі. Яна прадставіла на выставу больш за дзве сотні паштовак і фотаздымкаў з сямейнага архіва.

— Гэта памяць пра маіх бацькоў, — сказала Зоя Канстанцінаўна. — У сям'і збіралі паштоўкі і літаграфіі заўсёды, колькі я сябе памятаю. Жыццё было шэрым, і гэтыя карцінкі ўпрыгожвалі яго. І, безумоўна, нам проста пашанцавала: у апошнюю вайну дом захаваўся, а з ім і гарышча, дзе захоўваліся старыя рэчы.

Дзед Зоі Канстанцінаўны Фёдар Раманавіч Шыркоі служыў на пошце. У сямейным архіве захаваліся дакументы, з якіх вынікае, што ён атрымліваў 16 рублёў у месяц. За сваю працу ён быў узнагароджаны двума сярэбранымі медалямі, але ад аднаго адмовіўся і ўзяў прэмію грашыма, бо сродкаў на вялікую сям'ю не хапала. А бацька Урбановіч ваяваў у час Першай сусветнай вайны, і яго фотаздымкі тых гадоў таксама прысутнічаюць на выставе. Самае старое фота на выставе, дарэчы, датуецца 1867 годам.




### Не эротыка, а замілаванне

Паштоўкі і фота на выставе падзялілі на некалькі тэмаў. Першая: «Каханне праз гады і стагоддзі». Гэта віншавальныя паштоўкі, якія дасылаліся каханым. На іх пары танчаць, робяць падарункі, прызнаюцца ў сваіх пачуццях, нават высвятляюць адносіны і, у большасці, цалуюцца.

— Паглядзіце на гэтыя пацалункі, і вы не пабачыце ніякай пошласці і моднай цяпер эротыкі, — паказвае старшая навуковая супрацоўніца Мсціслаўскага музея Валянціна Цімашкова. — Гэтыя выявы выклікаюць пачуццё замілавання.

Асобная тэма — як выглядаюць жанчыны на старых паштоўках.

— Мінімум касметыкі, — каментуе Валянціна. — Не, вядома ж, і за тым часам свецкая жанчына карысталася і пудрай, і памадай, але толькі падкрэслівала сваю прыродную прыгажосць. Акцэнт рабіўся на прычоску, упрыгажэнне кветкамі, сукенку дапаўняла хустка ці карункавы каўнер.

***(Заканчэнне на 2-й стар.)***

**КУРСЫ ВАЛЮТ**

***Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.10.2007 г. (для б/н разлікаў)***

1 долар ЗША ................. 2 150,00
1 еўра ............................ 3 050,20
1 латвійскі лат .............. 4 341,24
1 літоўскі літ ................. 882,92
1 чэшская крона ............ 110,66
1 польскі злоты ............. 822,54
1 расійскі рубель .......... 86,25
1 украінская грыўня ...... 425,53

***Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў***

**Цэнтрабанк РФ**

USD ............ 24,9275
10 UAH ........ 49,3673
1000 BYR .... 11,5807
EUR ............ 35,3372

***Курс у гандлёвых кампаніях (на 17.10.2007 г.)***

USD ............ 2135 / 2210

**Агенцтва Уладзіміра Граўцова**

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

ISSN 1990 - 763X

07199>

